




Фотографии сноса бывших Казенных палат в центре Смоленска.
Газета «Рабочий путь». 1967 г.

1. Ильин, И. А. Собрание сочинений / И. А. Ильин. – М., 2001.
2. Козлов, Д. Клином красным бей белых / Д. Козлов // TATLIN [сайт]. – URL: https://tatlin.ru/articles/klinom_krasnym_bej_belyx (дата обращения: 24.03.2025).
3. Государственный архив Смоленской области (ГАСО). – Ф. Р-78. Оп. 1. Д. 2736. Л. 5.
4. ГАСО. – Ф. Р-78. Оп. 1. Д. 2796. Л. 72.
5. ГАСО. – Ф. Р-78. Оп. 1. Д. 2797. Л. 15об.

**Бароўская В.М.**

# ЛІСТЫ-ІНСТРУКЦЫІ ЯК КРЫНІЦА ПА ГІСТОРЫІ САВЕЦКА-ПОЛЬСКІХ АДНОСІН 1921–1939 гг.

*Ключавыя словы: дыпламатычная перапіска, паўнамоцны прадстаўнік, Народны камісарыят замежных спраў.*

Крыніцы савецка-польскіх адносін 1921–1939 гг. можна ўмоўна падзяліць на некалькі груп: заканадаўчыя крыніцы, крыніцы афіцыйнага справаводства, актавыя матэрыялы, матэрыялы статыстыкі, перыядычнага друку, мемуарная літаратура. Сярод крыніц афіцыйнага справаводства НКЗС РСФСР (СССР), якія адначасова маглі з’яўляцца актавымі дакументамі, неабходна адзначыць памятныя запіскі (ad-memoire), ноты. Гэтыя крыніцы рыхтаваліся непасрэдна Калегіяй НКЗС СССР (аддзел краін Прыбалтыкі і Польшчы, І Заходнім аддзелам), або Паўнамоцным прадстаўніцтвам СССР у Польшчы, па ўзгадненні тэксту з НКЗС, з мэтай вырашэння вузка спецыялізаванай праблемы двухбаковых адносін. Былі адрасаваны Міністэрству замежных спраў Польшчы (часта старшыні Усходняга аддзелу палітычнага дэпартамента), або паўнамоцнаму прадстаўніку Польшчы ў РСФСР (СССР), з намерам атрымання абавязковага адказу. Аналагічныя дакументы зыходзілі і ад МЗС Польшчы на адрас НКЗС РСФСР (СССР), паўнамоцнага прадстаўніка РСФСР (СССР) у Польшчы.

Лісты-інструкцыі і дзённікі сустрэч паўнамоцных прадстаўнікоў РСФСР (СССР) у Польшчы да членаў Калегіі НКЗС РСФСР (СССР), загадчыку Аддзела краін Прыбалтыкі і Польшчы НКСЗ уяўлялі сабой падрабязны агляд палітычнага і эканамічнага становішча Польшчы, характарыстыку стану савецка-польскіх адносін на канкрэтны момант часу, перспектывы іх развіцця, ацэньвалася верагоднасць ваеннай кампаніі, даваўся кароткі агляд польскага перыядычнага друку. Аналагічны характар носяць і лісты загадчыка Аддзела краін Прыбалтыкі і Польшчы НКЗС да паўнамоцнага прадстаўніка, паверанага ў справах, першага або другога сакратароў Паўнамоцнага прадстаўніцтва РСФСР (СССР) у Польшчы. Сістэматычнасць і паслядоўнасць, строгую сакрэтнасць адзначаныя дакументы набываюць падчас знаходжання на пасадзе паўнамоцнага прадстаўніка П.Л. Войкава. Гэтыя паведамленні перадаваліся праз

дыпламатычных кур'ераў два разы на тыдзень. У сваю чаргу ў дзённіках сустрэч паўнамоцных прадстаўнікоў узгадваюцца ў храналагічным парадку візіты прадстаўнікоў польскага дыплатычнага корпуса ў Паўнамоцнае прадстаўніцтва, іх сутнасць і агульнае ўражанне. Беларуская праблематыка ў лістах-справаздачах узнікае як вынік перапіскі члена Калегіі НКЗС СССР і саветнікаў па беларускіх справах (А.Ф. Ульянава, Ф.А. Браўковіча). Пры гэтым, калі разгледжанае пытанне не носіць востры і тэрміновы характар, то яно вырашаецца праз паўнамоцнага прадстаўніка, без непасрэднага звароту да саветніка. Гэты від гістарычных крыніц па праблеме захоўваецца ў сховішчах Архіва знешняй палітыкі Расійскай Федэрацыі (фонды 4, 04, 122, 09), Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь (фонд 242 п, 4п) і часткова апублікаваны ў зборніку "Советско-польские отношения в 1918–1945 гг.", прадстаўленым у чатырох тамах [1; 2; 3], "Савецкая і Заходняя Беларусь: раз'яднаныя, але адзіныя. 1921–1939 гг. Дакументы і матэрыялы" [4].

Яскравым прыкладам гэтай групы крыніц з'яўляюцца лісты-інструкцыі члена Калегіі НКЗС СССР Б.С. Стаманякова да паўнамоцнага прадстаўніка СССР у Польшчы П.Л. Войкава, датаваныя чэрвенем 1926 г. – чэрвенем 1927 г. Сярод праблем, якія ўздымаліся на старонках гэтай групы крыніц неабходна вылучыць пытанні выканання асноўных умоў Рыжскага мірнага дагавора 18 сакавіка 1921 г., заключэння савецка-польскага "Дагавора аб ненападзенні", гандлёвай дамовы. Пры гэтым вядзенне перагавораў па выпрацоўцы асноўных умоў "для высвятлення пунктаў гледжаня абодвух бакоў па шэрагу істотных пытанняў, без узгаднення якіх, па меркаванні польскага міністра замежных спраў, заключэнне плануемага дагавора магло б сустрэцца з сур'ёзнымі цяжкасцямі" "Дагавора аб ненападзенні" адбывалася шляхам сустрэч паўнамоцнага прадстаўніка СССР у Польшчы (П.Л. Войкава) з прадстаўнікамі Міністэрства замежных спраў Польшчы (міністрам, віцэ-міністрам, дырэктарам Усходняга дэпартамента Г. Янкоўскім); прадстаўніка Польшчы ў СССР (С. Кентшыньскі, С. Патэк) з членамі Калегіі НКЗС СССР (аддзел Польшчы і Прыбалтыкі С.І. Аралаў – Б.С. Стаманякоў, рэдка народным камісарам замежных спраў).

Беларуская праблематыка, у першую чаргу звязаная з развіццём нацыянальна-вызваленчага руху на тэрыторыі Заходняй Беларусі, таксама была адной з ключавых тэм лістоў-інструкцый Калегіі НКЗС СССР. Праблема Заходняй Беларусі не займала цэнтральнага месца ў савецка-польскіх адносінах 1920-х гг., аднак аказвала негатыўны ўплыў на іх нармалізацыю. Праз беларускае савецкае кіраўніцтва (па лініі ЦК КП(б)Б–ЦК КПЗБ) адбывалася фінансаванне праз пасрэдніцтва Беларускага кааператыўнага банка ў Вільні і Транзітнага банка ў Рызе дзейнасці не толькі КПЗБ і КСМЗБ, але і БСРГ. Яскрава гэта прадстаўлена ў перапісцы саветніка па беларускіх справах пры Паўнамоцным прадстаўніцтве СССР у Польшчы А.Ф. Ульянава з Прадстаўніцтвам КПЗБ у Мінску. Пасада саветніка па беларускіх справах была ўведзена пры дыпламатычным савецкім прадстаўніцтве ў Варшаве ў чэрвені 1925 г. з мэтай каардынацыі і аказання фінансавай дапамогі нацыянальна-вызваленчага руху (БСРГ, ТБШ) Заходняй Беларусі, збору інфармацыі аб грамадска-палітычным жыцці гэтага рэгіёна. У сваю чаргу, дзякуючы намаганням А. Ф. Ульянава і пры кантролі ЦК КП(б)Б, была арганізавана ў верасні 1925 г. Данцыгская нарада (праходзіла пад кодавым словам «вяселле»), на якой былі ўзгоднены асноўныя накірункі сумеснай дзейнасці КПЗБ і БСРГ па супрацьдзеянні польскай асіміляцыйнай палітыцы ў Заходняй Беларусі, намаганням польскага кіраўніцтва па стварэнні праўрадавай групоўкі сярод беларускага нацыянальна-вызваленчага руху прапольскай накіраванасці. Акрамя таго, пры пасрэдніцтве А.Ф. Ульянава, па ініцыятыве Палітбюро ЦК РКП(б) – УКП(б) і пры садзейнічанні ЦК КП(б)Б была склікана II Усебеларуская канферэнцыя ў Берліне 12–16 кастрычніка 1925 г., з мэтай ліквідацыі беларускай палітычнай эміграцыі па-за межамі Савецкай Беларусі (Польшча, Латвія, Літва, Чэхаславакія), пачалося планамернае вяртанне прадстаўнікоў беларускага нацыянальнага руху ў Мінск як цэнтр беларускай савецкай дзяржавы. Усе гэтыя акцыі кардынальным чынам змянялі агульную растаноўку палітычных сіл у Заходняй Беларусі, умацоўвалі

савецкі ўплыў і ідэю аб немінучасці аб'яднання двух беларускіх адзінак у адно дзяржаўнае ўтварэнне. Зразумела, што польскае кіраўніцтва прадпрымала ў адказ пэўныя крокі па нейтралізацыі гэтай кампаніі, па падаўленні незадавальнення сярод мясцовага насельніцтва Заходняй Беларусі мерапрыемствамі польскіх кіруючых колаў. Адной з яскравых праяў стала ліквідацыя БСРГ, арышт яе кіраўнікоў і актыўных членаў, адкрыты судовы працэс над імі.

Важнае месца займае перапіска саветніка па беларускіх справах пры Паўнамоцным прадстаўніцтве СССР у Польшчы А.Ф. Ульянава з ЦК КП(б)Б, ЦК КПЗБ, з С.Л. Казюра (упаўнаважаным НКЗС СССР пры СНК БССР 1925–1928 гг., Ф.А. Браўковічам (саветнікам паўнамоцнага прадстаўніцтва СССР у Польшчы 1928–1931 гг.). Пры аналізе гэтага роду гістарычных крыніц выявілася адна вельмі цікавая асаблівасць: частка пісем аўтарызавана пад імем А. Ульянава, а частка пад імем Алеся Загорнага (яго партыйны псеўданім). Выбар на карысць таго ці іншага варыянта залежаў ад адрасатаў лістоў – у ЦК КПЗБ (Алесь Загорны), у ЦК КП(б)Б ці ў Калегію Народнага камісарыята замежных спраў СССР (А.Ф. Ульянаў). Таксама меў важнае значэнне і змест лістоў. У разлік бралася і ступень іх сакрэтнасці. Зразумела, што лісты з грыфам «зусім сакрэтна» дасылаліся ад Алеся Загорнага і шыфраваліся [5].

Перапіска Ф.А. Браўковіча, першага саветніка Паўнамонага прадстаўніцтва СССР у Польшчы, і А.Ф. Ульянава, упаўнаважанага НКЗС СССР пры СНК БССР, за 1929–1930 гг. утрымліваецца ў фондзе 242п Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь. У лістах знаходзяць асвятленне пытанні ўнутрыпалітычнага становішча Заходняй Беларусі, арганізацыі і дзейнасці Камітэта дапамогі галадаючым Заходняй Беларусі, дзейнасці Таварыства беларускай школы і іншыя праблемы. У Нацыянальным архіўным фондзе ўтрымліваецца 27 лістоў Ф.А. Браўковіча да А.Ф. Ульянава. Толькі тры лісты ад імя А.Ф. Ульянава да Ф.А. Браўковіча. Тры лісты Ф.А. Браўковіча на імя К.Ф. Бэнека, выконваючага абавязкі ўпаўнаважанага НКЗС СССР пры СНК БССР, на час адпачынку А.Ф. Ульянава. Копіі лістоў дасылаліся сакратару Мінскага абласнога камітэта КП(б)Б А.С. Славінскаму, М.А. Елізаровічу, сакратару Бюро дапамогі КПЗБ (1924–1925 гг.), старшыні Прадстаўніцтва КПЗБ у Мінску (1925–1931 гг.), М.А. Карскаму, загадчыку аддзела балтыйскіх краін і Польшчы НКЗС СССР (1925–1929 гг.). Усе лісты былі напісаны на рускай мове, пазначаны грыфам цалкам сакрэтна, пранумараваны. Усяго за перыяд з сакавіка 1929 г. і па лістапад 1930 г. было накіравана ад Ф.А. Браўковіча да А.Ф. Ульянава 137 лістоў. На жаль, з іх захавалася толькі 27 лістоў [5].

Такім чынам, значная частка крыніц па праблеме ўзаемаадносін Савецкай Беларусі і Польшчы ў 1921–1939 гг. апублікавана і ўведзена ў навуковае карыстанне. Аднак, на вялікі жаль, даследчыкі не маюць шырокага доступу да архіўных матэрыялаў шэрагу сховішчаў Расійскай Федэрацыі (напрыклад, Архіва знешняй палітыкі). Патрабуюць больш глыбокага вывучэння і публікацыі матэрыялы асабістага паходжання. Накладвае адбітак спецыфіка дыпламатычных матэрыялаў, у тым ліку і лістоў-інструкцый, якія мелі строга сакрэтны характар. Інфармацыя, якая ўтрымліваецца ў крыніцах гэтай групы, дазваляе даследчыку найбольш поўна рэканструяваць асобныя падзеі савецка-польскіх адносін, прадставіць тонкія нюансы. Толькі комплексны аналіз крыніц дазволіць папоўніць фактычную базу па праблеме.

1. Советско-польские отношения в 1918–1945 гг. : сборник документов : в 4 т. / под общ. ред. М. М. Наринского, А. В. Мальгина. – М. : Аспект Пресс, 2017. – Т. 1 : 1918–1926. – 627 с.

2. Советско-польские отношения в 1918–1945 гг. : сборник документов : в 4 т. / под общ. ред. М. М. Наринского, Н. Е. Клейменовой, С. А. Склярова. – М. : Аспект Пресс, 2017. – Т. 3 : 1932–1939. – 637 с.

3. Советско-польские отношения в 1918–1945 гг. : сборник документов : в 4 т. / под общ. ред. С. А. Склярова, М. С. Павловой. – М. : Аспект Пресс, 2017. – Т. 2 : 1926–1932. – 630 с.

4. Савецкая і Заходняя Беларусь: раз'яднаныя, але адзіныя. 1921–1939 гг. Дакументы і матэрыялы / склад. В. М. Бароўская. – Мінск : НАРБ, 2024. – 332 с.

5. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 242п. Воп. 2. Спр. 191, 223.